Ф 247

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ПЕДАГАГІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Фарміраванне асобы студэнта і школьніка на аснове духоўных каштоўнасцей грамадства

МІНСК, 1995

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ М.ТАНКА
ПЕДАГАГІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ СТУДЭНТА І ШКОЛЬНІКА НА АСНОВЕ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ГРАМАДСТВА

**Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-прктычнай канферэнцыі**

71834
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт БІБЛІЯТЭКА
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

МІНСК 1996

ББК 74.58
Ф 247

Друкуецца па рашэнню рэдакцыйна - выдавецкага
савета БДПУ імя М.Танка.

Рэдкалегія: А.І.Баранава, А.Ул.Гарбатава, А.А.Грымаць
(галоўны рэдактар), М.М.Ярмалінская

Рэцэнзент: кафедра педагогікі Мінскага лінгвістычнага
універсітэта.

Прадстаўлены разнапланавыя матэрыялы па праблеме фарміравання асобы школьніка і студэнта. Адрасаваны навукоўцам, выкладчыкам вышэйшых навучальных установ, аспірантам, якія знойдуць у ім цікавую і карысную інфармацыю.

© Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя М.Танка, 1996.

JSBN985-6087-10-4

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ФАРМІРАВАННЕ ЭКАЛАГІЧНАГА СВЕТАПОГЛЯДУ Ў СІСТЭМЕ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ

*А.І.Андарала*

Экалагічныя ўмовы ў Беларусі, асабліва ў асобных яе абласцях, на дзесятым годзе я аварыі на Чарнобыльскай АЭС застаюцца неспрыяльнымі. Экалагічная лема ў рэспубліцы набыла глабальны характар. Праблема якасці навакольнага оддзя ахапіла ўсе бакі жыцця насельніцтва, і таму экалагічная адукацыя і выхаванне і тым фактарам, без якога нельга ў будучым забяспечыць далейшае развіцце адства і сапраўднае рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

Ва ўмовах неспрыяльных экалагічных абставін, глабальнага ўздзеяння на прыроду, арэння навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу, развіцця ідэй бесперапыннай цыі ўсё большую актуальнасць набывае праблема экалагічнай адукацыі і вання ўсіх катэгорый насельніцтва. Сёння кожнаму грамадзяніну незалежна ад таго, у і галіне гаспадаркі ён працуе, неабходны экалагічныя веды, культура адносін з одай. Ён павінен разумець сэнс уздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе, ь аналізаваць магчымыя вынікі ўздзеяння, прадбачыць і не дапусціць экалагічных лізмаў і катастроф.

Вырашыць гэтую праблему,на наш погляд,магчыма толькі ў межах сістэмы ерапыннай адукацыі, адной з важнейшых задач якой з"яўляецца фарміраванне агічнага светапогляду сродкамі ўсіх звенняў, уключаючы дашкольныя ўстановы, аадукацыйныя школы, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, сярэднія спецыяльныя і эйшыя навучальныя ўстановы, пазашкольныя выхаваўчыя ўстановы, курсы шэння кваліфікацыі і інш. Такім чынам, экалагічная адукацыя і выхаванне павінны яць стройную сістэму, якая развіваецца з дашкольнага выхавання, улічваючы вень адукацыйнай падрыхтоўкі асобы.

Вытокі экалагічнай культуры асобы бяруць свой пачатак у дашкольным сце, калі дзіця ўпершыню знаёміцца з прыродай. Таму пачатковым звяном

у сістэме бесперапыннай экалагічнай адукацыі і выхавання з"яўляюц дашкольныя дзіцячыя ўстановы.

Знаёмства дзяцей дашкольнага ўзросту з жывой і нежывой природ вызначаецца праграмай выхавання і навучання ў дзіцячым садзе. Аднак пэўн устаноўкі на ажыццяўленне мэтанакіраванага экалагічнага выхавання праграма не дае.

Асноўныя задачы экалагічнага выхавання ў дашкольных установах:

- выхоўваць у дзяцей любоў да роднай прыроды, садзейнічаць успрыманн адчуванню яе прыгажосці, выпрацаваць уменне беражліва адносіцца да раслін і жывел;
- засвоіць элементарныя веды аб прыродзе і на іх аснове сфарміраваць дашкольнікаў шэраг канкрэтных і абагульненых уяўленняў аб з"явах жывой нежывой прыроды.

Наступным этапам у сістэме бесперапыннай экалагічнай адукацыі і выхаван з"яўляецца агульнаадукацыйная школа. Асобнае месца ў звяне агульнаадукацыйн школы займае пачатковая школа, якая мае пераемную сувязь з дашкольнымі ўстановамі, тым ліку і ў напрамку экалагічнай адукацыі і выхавання. Малодшыя школьні вывучаюць састаўныя элементы прыроды, яе сезонныя змены, вызначаю элементарныя прычыны гэтых змен.

Пачынаючы з 5-га класа, школьнікі маюць магчымасць знаёміцца з тымі праблемамі, але ўжо ў гістарычным аспекце, аналізаваць развіццё грамадства выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

Праблема экалагічнай адукацыі і выхавання з улікам пераемнасці ўскладняц і пашыраецца ў старэйшых класах. Школьнікі павінны прыйсці да разумення адзінст грамадства і прыроды, пашырыць паняцце аб прыродным асяроддзі, яго кампанента атрымаць уяўленне аб дапушчальных нормах забруджанасці, аб ахове прыродны комплексаў, асобных відаў раслін і жывёл, дзяржаўных мерах па ахове прыроды рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў.

Важным састаўным звяном ў бесперапыннай экалагічнай адукацыі і выхаван з"яўляецца сістэма прафтэхадукацыі. Фарміраванне экалагічнай культуры навучэнц прафесійна-тэхнічных вучылішчаў павінна ажыццяўляцца пры вывучэнні прадмет агульнаадукацыйнага, прафесійна-тэхнічнага цыклу і грамадскіх навук. Экалагічная адукацыя і выхаванне будучых рабочых павінна мець і пэўную спецыфіку, якая звязана з прафесіяй.

Найбольш складаны этап уяўляе сабой экалагічная адукацыя і выхаванне тэхнікумах і ВНУ, якім належыць галоўная роля ў падрыхтоўцы спецыялістаў.

Такім чынам, сістэма бесперапыннай адукацыі і выхавання, на наш погляд, азнача сукупнасць названых звенняў, якія знаходзяцца ў сувязі адно з другім, ствараючы пэўну цэласнасць.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ